ЗАЦВЯРДЖАЮ

Начальнік аддзела культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта

Т.М.Ражэва

# ІНСТРУКЦЫЯ

аб парадку арганізацыі і правядзенні раённага агляда-конкурса па ўсіх відах і жанрах аматарскай мастацкай творчасці “Распахнем аконца творчасці”, прысвечанага Году беларускай жанчыны

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляда-конкурса па ўсіх відах і жанрах аматарскай творчасці “Распахнем аконца творчасці” (далей – агляд-конкурс).

2. Асноўнымі мэтамі агляда-конкурса з’яўляюцца: развіццё і папулярызацыя ўсіх відаў і жанраў аматарскай мастацкай творчасці ва ўстановах культуры раёна; арганізацыя вольнага часу розных груп насельніцтва, у тым ліку людзей сталага ўзросту; садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы; адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай духоўнай і культурнай спадчыны, самабытных традыцый беларускага народа, павышэнне мастацкага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў аматарскай мастацкай творчасці.

3. Арганізатарам агляда-конкурса з’яўляюцца аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта і дзяржаўная ўстанова культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”.

4. У аглядзе-конкурсе прымаюць удзел структурныя падраздзяленні дзяржаўнай установы культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”.

5. На агляд-конкурс прадстаўляецца цэласная тэматычная праграма, працягласцю да 40 хвілін, у якой павінны быць прадстаўлены ўсе жанравыя накірункі мастацтва, якія атрымалі развіццё ва ўстанове. Установы, у якіх дзейнічаюць тэатральныя калектывы, павінны ўключыць у праграму агляда-конкурса тэатральны эпізод з яго абавязковай выдыёфіксацыяй. Журы будзе асобна ацэньваць майстэрства вядучых, іх артыстычнасць, культуру прамовы, эмацыянальнасць, здольнасць да імправізацыі.

6. Агляд-конкурс аматарскай мастацкай творчасці праводзіцца са студзеня  па сакавік 2026 года (па асобнаму графіку).

7. Ацэнка тэматычных праграм, прадстаўленых на агляд-конкурс, будзе ажыццяўляцца па наступных намінацыях:

- лепшая тэматычная праграма;
- лепшая фальклорная праграма;

- харавое, вакальнае, сольнае выкананне;
- мастацкае чытанне;
- майстэрства вядучага;
- самадзейная тэатральная творчасць;
- музычнае і мастацкае афармленне праграмы;
- лепшая выстава народнай творчасці (персанальныя выставы).

8. Пераможцы агляда-конкурса будуць ўзнагароджаны Дыпломамі і каштоўнымі падарункамі.

9. Фінансаванне конкурса ажыццяўляецца за кошт пазабюджэтных сродкаў ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".

10. Лепшыя тэматычныя канцэртныя праграмы і індывідуальныя выканаўцы будуць запрошаны да ўдзелу ў раённых святочных мерапрыемствах.

11. Склад журы агляда-конкурса:

| | | |
|---|---|---|
| Ражэва Таццяна Мар'янаўна | – | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама; |
| Чудакоўская Наталля Станіславаўна | – | галоўны спецыяліст аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама *(са згоды);* |
| Сабінская Ганна Сяргееўна | – | намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Камінская Вікторыя Ігараўна | – | мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Харко Іна Паўлаўна | – | кіраўнік народнай эстраднай студыі "Мираж" дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры". |